Источник: “Рэспубліка” – 2020-06-25

# Здымаю шапачку

Грыбны сезон сёлета спазняецца. Аднак аматары ціхага палявання не губляюць надзеі і пільна сочаць за прагнозамі сіноптыкаў. Пасля кожнага дажджу, поўныя спадзяванняў, яны спяшаюцца з кошыкамі ў лес. Тыя, каму ціхае паляванне не па душы, за свежымі дарамі лесу едуць на рынкі. Там ужо з’явіліся першыя грыбы і суніцы. Цэны пакуль кусаюцца. Яно і зразумела — дароў лесу яшчэ няшмат. У Мінску за кілаграм лісічак просяць 35 рублёў, дурніц — 38 рублёў, а за маленькую шкляначку суніц — ад 5 рублёў. Карэспандэнт «Р» даведалася, дзе і якія ягады і грыбы можна будзе знайсці ў лясах гэтым летам?

Грыбны сезон сёлета спазняецца. Аднак аматары ціхага палявання не губляюць надзеі і пільна сочаць за прагнозамі сіноптыкаў. Пасля кожнага дажджу, поўныя спадзяванняў, яны спяшаюцца з кошыкамі ў лес. Тыя, каму ціхае паляванне не па душы, за свежымі дарамі лесу едуць на рынкі. Там ужо з’явіліся першыя грыбы і суніцы. Цэны пакуль кусаюцца. Яно і зразумела — дароў лесу яшчэ няшмат. У Мінску за кілаграм лісічак просяць 35 рублёў, дурніц — 38 рублёў, а за маленькую шкляначку суніц — ад 5 рублёў. Карэспандэнт «Р» даведалася, дзе і якія ягады і грыбы можна будзе знайсці ў лясах гэтым летам?

## Дробныя дары

На Камароўцы наведвальнікі ў асноўным бяруць клубніцы і чарэшню. Попыт на першыя лясныя ягады і грыбы невялікі — кошт пакуль не радуе. Аднак кожны тавар знойдзе свайго пакупніка. Вось проста на маіх вачах жанчына бярэ шкляначку лісічак. Кажа, так засумавала за зіму па смажаных грыбах, што гатовая пераплаціць. Прадавец Марыя са Смалявічаў саступае 2 рублі: хутка электрычка, а ў сумцы яшчэ дзве такія шкляначкі не прададзеныя. Каб разгаварыць прадаўца, забіраю адну з тых порцый свежых лісічак, якія засталіся.

— Грыбоў у лесе няшмат. Знайшла некалькі сямеек лісічак і ўсё, — разводзіць рукамі Марыя.

Дарэчы, акрамя яе на Камароўцы грыбамі сёння не гандлюе ніхто.

— Учора стаяў мужчына з Пухавіцкага раёна і пенсіянерка з Асіповіцкага. А больш нікога! Якія грыбы? Лісічкі ў асноўным. У мужчыны была адна шкляначка баравікоў. Каля 30 рублёў прасіў.

— На мінулых выхадных ездзілі ў Жыткавічы. Лісічкі вельмі дробныя. Знайшлі пару маслят. Усе чарвівыя, — падключаецца да размовы яшчэ адзін пакупнік. — Сябар на гэтых выхадных праверыў лес пад Вілейкай. Знайшоў дробную лісічку, але гэтага нават на суп не хопіць. Трэба тыдзень пачакаць...

Заўзятыя грыбнікі дзеляцца першым уловам у сацыяльных сетках.

— Карацей, усім прыгатавацца, вастрым нажы, прасуем хусткі! Пайшлі жоўценькія. Бабруйскі раён — 3кг.

— Вілейскі раён пачынае прачынацца, гэта радуе. Не люблю браканьернічаць ды дзерці малых, але ўжо вельмі захацелася супчыка.

— Магілёўская вобласць, Чавускі раён. Забеглі пасля працы на 10 хвілін у лес. Маслянят вельмі шмат.

— Новалукомль, гулялі па лесе, лісічкамі абсыпаныя ўсе краі дарогі. Праўда, вельмі маленькія, як гарошынкі, толькі прабіваюцца. Чарніц таксама будзе шмат.

Кажуць, лісічкі ёсць у Вілейскім, Лагойскім, Нарачанскім, Браслаўскім і Бабруйскім раёнах. Масляты і падбярозавікі ўжо знаходзілі ў Мазырскім і Кобрынскім раёнах. Але ўсе сыходзяцца ў адным: пакуль грыбоў не так шмат, як хацелася б.

Калі ўважліва прайсціся па гандлёвых радах Камароўкі, то можна знайсці першыя садовыя і лясныя суніцы — 10 і 15 рублёў адпаведна. Прадаюць пакуль не кілаграмамі, а шкляначкамі па 0,5 літра. Ля ўваходу ў метро «Каменная горка» суніцы аддаюць танней — 5 рублёў за шкляначку.

## Грыбное месца

А што кажуць навукоўцы? Прагназаваннем ураджайнасці грыбоў і ягад Інстытут лесу Акадэміі навук займаецца з 2006 года. Навуковы супрацоўнік сектара харчовых і лекавых рэсурсаў лесу Таццяна Маісеева расказала, чаго чакаць ад гэтага года:

— Аналіз умоў надвор’я паказаў, што восень і зіма былі анамальна цёплымі, з недастатковай колькасцю ападкаў. Да таго ж, на большай частцы тэрыторыі краіны (акрамя Віцебскай і Мінскай абласцей), асабліва па паўднёвым усходзе, адчуваўся дэфіцыт ападкаў (60 працэнтаў нормы), перш за ўсё ў студзені. Зіма стала самай маласнежнай за ўсю гісторыю метэаназіранняў. На тэрыторыі Брэсцкай і Гомельскай абласцей снежнае покрыва наогул адсутнічала. У выніку цёплых зімовых месяцаў ягадныя расліны павялічылі расход пажыўных рэчываў, што прывяло да іх паслаблення да пачатку вегетацыйнага сезона.

Анамальна нізкія тэмпературы паветра ў канцы красавіка — пачатку мая паўплывалі на ўраджайнасць чарніц. У асобных месцах пацярпела ад 5 да 20 працэнтаў бутонаў і кветак гэтай ягады, асабліва ў Палескай нізіне. У цэлым, добры стан ягаднікаў зафіксаваны ў Віцебскай вобласці, здавальняючы — у Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай.

З-за значнага дэфіцыту глебавай вільгаці і зніжэння ўзроўню грунтавых вод, што назіраецца ў апошнія гады перш за ўсё на поўдні краіны, надземная частка журавін на балотах падсыхае. Яе месца запаўняюць дурніцы тваністыя. У апошнія гады адмоўна адбіваюцца тэмпературныя анамаліі на развіцці і плоданашэнні брусніц перш за ўсё зноў жа ў паўднёвых рэгіёнах. Усе гэтыя негатыўныя працэсы не маглі не адбіцца на паказчыках ступені плоданашэння ягадных раслін. Ссунуліся тэрміны пачатку нарыхтовак ягад.

— Пры спрыяльных умовах надвор’я летам у Віцебскай і Гродзенскай абласцях прагназуецца ўраджайнасць чарніц вышэй сярэдняга значэння (бал 4). У Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях ураджай чакаецца сярэднім (бал 3) і ніжэй сярэдняга (бал 2) — у Магілёўскай, — агучвае прагноз Таццяна Маісеева. — Плоданашэнне брусніц звычайных у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях у гэтым годзе можа быць ніжэйшым за сярэдні (бал 2), у Магілёўскай — сярэднім (бал 3). Вышэй (бал 4) па прагнозах яно будзе толькі ў Віцебскай вобласці. У гэты ж час у Гомельскай ураджай прагназуецца нізкім (бал 1).

Прагназуемая ўраджайнасць дурніц тваністых у Віцебскай вобласці чакаецца сярэдняй (бал 3), у астатніх — ніжэй сярэдняга (бал 2). Вышэй за сярэдні (бал 4) ураджай журавін балотных можна чакаць у Віцебскай вобласці. Сярэдняя ўраджайнасць гэтых ягад чакаецца ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, у астатніх — ніжэй за сярэдні.

Таццяна Маісеева кажа:

— Што датычыцца грыбоў, то па краіне лакальна ўжо адзначаны першыя іх віды — падбярозавікі і масляты на Брэсцкім Палессі, у Мінскай і Гомельскай абласцях. У

сувязі з выпадзеннем ў апошнюю дэкаду чэрвеня па шэрагу рэгіёнаў ападкаў у бліжэйшы час можна чакаць з’яўленне ў лясах лісічак і іншых ядомых грыбоў.

Ураджай ўсіх рэсурсаўтваральных відаў ядомых грыбоў чакаецца ў гэтым сезоне сярэднім у Віцебскай вобласці. Сярэднім можа быць плоданашэнне апенькі восеньскай па ўсіх абласцях краіны, а таксама лісічкі і падбярозавіка — у Брэсцкай і Магілёўскай абласцях. Ураджай астатніх відаў грыбоў ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Віцебскага, прагназуецца нізкім (бал 1). Пры дастатковай колькасці ападкаў у ліпені, жніўні і верасні плоданашэнне ўсіх відаў ядомых грыбоў можа быць больш высокім. У любым выпадку аматарам ціхага палявання не трэба засмучацца. Больш за ўсё грыбоў — каля 86 працэнтаў ад гадавога ўраджаю — бывае звычайна з другой дэкады жніўня і да замаразкаў.